## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

**Бяспалая М. А.,**
**доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Пры атэстацыі кожнай вышэйшай навучальнай установы наяўнасць вызначаных дзяржавай працэнтных суадносін кадраў вышэйшай кваліфікацыі ад усёй колькасці выкладчыкаў з'яўлецца адной з важнейшых характарыстык. Для ВНУ культуры і мастацтва гэты паказчык таксама адзін з галоўных. Безумоўна, павелічэння колькасці выкладчыкаў са ступенямі і званнямі галоўным чынам можна дасягнуць толькі праз іх падрыхтоўку ў аспірантуры і дактарантуры. На сённяшні дзень у вышэйшых навучальных установах, падпарадкаваных Міністэрству культуры, па 10 навуковых спецыяльнасцях навучаецца 167 аспірантаў і дактарантаў, з іх больш паловы — у БДУ культуры і мастацтваў. Трэба заўважыць, што навуковыя спецыяльнасці, па якіх адбываецца падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі, адпавядаюць асноўным кірункам развіцця культуры і мастацтваў.

Як спрыяльны момант трэба адзначыць і наяўнасць саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый ва ўсіх трох ВНУ. Такім чынам. сістэма падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, якая сфарміравалася ў ВНУ культуры і мастацтваў, дазваляе выконваць адпаведныя дзяржаўныя патрабаванні.

Аднак нельга не звярнуць увагу на шэраг негатыўных момантаў, якія ўплываюць на эфектыўнасць гэтага працэсу. Некаторыя з іх характэрны для ўсіх ВНУ і маюць хутчэй за ўсё арганізацыйны характар. Перш за ўсё, гэта праблема адбору кадраў у аспірантуру, а цяпер і магістратуру. Падаецца, што для вузаў культуры і мастацтваў у ёй дадаткова праяўляецца адзін дастаткова спецыфічны момант: часта лічыцца, што творча адораны студэнт будзе такім жа таленавітым і ў навуцы. Аднак, як паказвае практыка, у большасці выпадкаў такое не адбываецца. Таму над удасканаленнем сістэмы падбору кадраў у магістратуру і аспірантуру ў ВНУ культуры і мастацтваў трэба пастаянна працаваць, гэта ў многім залежыць ад стаўлення выкладчыкаў і загадчыкаў кафедр да праблемы падбору кандыдатур у магістратуру і аспірантуру, ад разумення яе важнасці, жадання і ўмення падтрымліваць падаючага надзеі маладога навукоўца на працягу студэнцкіх гадоў. У гэтым працэсе можа быць задзейнічана як вучэбна-даследчая работа (падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў у межах вучэбных заняткаў, курсавых і дыпломных работ), так і навукова-даследчая работа (выступленні на навуковых студэнцкіх канферэнцыях, удзел у конкурсах студэнцкіх навуковых прац, публікацыя лепшых работ і інш). Толькі той студэнт, які мае пэўны вопыт і апублікаваныя вынікі навуковай дзейнасці, можа прэтэндаваць на месца ў аспірантуры, і ад яго можна чакаць паспяховай работы над дысертацыяй, таму што вучыць методыцы навуковай працы ў аспірантуры няма магчымасці і часу.

Якія б супрацьлеглыя думкі не ўзнікалі ў сувязі з ператварэннем магістратуры ў першую ступень падрыхтоўкі навуковых кадраў, аднак першы год яе дзеяння па новых правілах прынёс і станоўчыя моманты. На наш погляд, як гэта не складана для магістрантаў, але здача кандыдацкага мінімуму вызваліць час у аспірантуры для работы непасрэдна над дысертацыяй. Да гэтага далучаецца і той момант, што падчас падрыхтоўкі магістэрскай дысертацыі набываецца пэўны вопыт сур'ёзнай навуковай работы па збору, аналізу, афармленню матэрыялу, частку якога можна будзе выкарыстоўваць у кандыдацкай дысертацыі. На паспяховае ў будучым заканчэнне аспірантуры, безумоўна, паўплывае прынцып пераемнасці пры вызначэнні праблемнага поля курсавой, дыпломнай, магістэрскай і кандыдацкай работ.

Важнейшае значэнне ў працэсе падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі набывае кантроль за ім з боку навуковых кіраўнікоў і выпускаючых кафедраў. Зыходзячы з вопыту БДУ культуры і мастацтваў, можна адзначыць фарміраванне адпаведнай сістэмы кантролю, арганізацыйную частку якога ажыццяўляе аспірантура, навукова-метадычную — кафедры, навуковыя кіраўнікі і апошнім часам Савет маладых вучоных. На ўсіх выпускаючых кафедрах працуюць метадалагічныя семінары, праз якія праходзяць першапачаткова дысертацыі аспірантаў і толькі пасля адабрэння семінарам дысертацыйныя работы паступаюць на кафедру. Здавалася б, прадугледжана многае,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каб дапамагчы аспіранту прадставіць работу ў тэрмін, згодна дзяржаўным патрабаванням. Аднак у асноўным большасць аспірантаў выпускаецца з рэкамендацыяй кафедры, а потым пачынаецца доўгі працэс дапрацоўкі і абарона ў тэрмін не адбываецца. Прычын для гэтага шмат і, на наш погляд, галоўныя заключаюцца ў тым, што мы зноў звяртаемся да прызнання неабходнасці больш дасканалага адбору паступаючых у аспірантуру, павышэння эфектыўнасці кантролю за працэсам падрыхтоўкі дысертацыі. Трэба прызнаць і немалаважнае значэнне, якое набываюць асабістыя якасці аспіранта і яго навуковага кіраўніка.

Нельга не закрануць праблему неабходнасці ўдасканалення наменклатуры навуковых спецыяльнасцей. Пэўнае негатыўнае ўздзеянне на працэс падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў аказвае стэрэатып уяўлення, што сацыякультурная сфера можа развівацца без фундаментальнага навуковага суправаджэння, толькі карыстаючыся традыцыйнымі метадамі, праверанымі шматвяковай практыкай. Развіццё гэтай сферы, якая мае непасрэднае дачыненне да сацыяльнага і духоўнага стану кожнага чалавека і грамадства ў цэлым, далучэнне яе да інавацыйных працэсаў, не павінны і не могуць адбывацца спантанна. Дзяржаўная палітыка ўлічвае гэтыя абставіны, адлюстраваннем чаго стала адкрыццё ў 1989 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў аспірантуры па спецыяльнасці «Тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветніцкай дзейнасці».

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў БДУ культуры і мастацтваў пачалася па гэтай навуковай спецыяльнасці. Навука аб арганізацыі вольнага часу зусім маладая, яна пачала фарміравацца ў другой палове XIX ст. адначасова з пашырэннем уяўленняў сярод самых шырокіх колаў еўрапейскага грамадства аб каштоўнасці вольнага часу і адпачынку. Паступова стварaліся пэўныя арганізацыйныя формы правядзення вольнага часу, найбольш эфектыўныя з іх пераходзілі межы дзяржаў. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены ў развіцці грамадства выклікалі змены ў падыходах да формы і зместу арганізацыі вольнага часу. Найбольш выразным прыкладам гэтага з'яўляецца сітуацыя ў сацыякультурнай сферы ў савецкі перыяд.

Вольны час асобы, які па сваім аб'ёме пачынае перавышаць працоўны час, — адзін з самых каштоўных набыткаў цывілізацыі, нароўні з ведамі і здароўем. Тэарэтыка-метадычнае абгрунтаванне неабходнасці арганізацыі вольнага часу, пошук заканамернасцей гэтага працэсу, іх практычная рэалізацыя з'яўляюцца важнымі задачамі сучаснага грамадства. Без цеснага ўзаемадзеяння фундаментальных гуманітарных навук такіх, як псіхалоія, педагогіка, сацыялогія, філасофія і інш., і практычнага ўкаранення іх набыткаў у сацыякультурную сферу немагчыма дасягнуць станоўчых вынікаў у арганізацыі вольнага часу, а тым самым і ўздзеяння на канкрэтную асобу і грамадства ў цэлым. У зборніку «Наука Беларуси в XX столетии», які выйшаў у 2001 г., нават не ўпамінаюцца такія навуковыя кірункі, як тэорыя, методыка і арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці. Фактычна па-за межамі навуковага прызнання засталася глабальная праблема — арганізацыя вольнага часу, які ўплывае на фарміраванне асобы ў такой жа ступені, як і працэсы вучобы і працы.

Імклівае развіццё сучасных інавацыйных працэсаў вымагае пошуку адпаведных сродкаў па іх выкарыстанню ў сацыякультурнай сферы. У якасці аднаго з найбольш эфектыўных крокаў трэба разглядаць падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі, што адпавядаюць сучасным патрабаванням. У такой навуковай спецыяльнасці, як тэорыя, методыка і арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці, інавацыйныя кірункі звязаны ў першую чаргу з даследаваннямі прадзюсерства ў культуры і мастацтве, навуковым абгрунтаваннем рэальнай творчасці розных груп насельніцтва, іх інтарэсаў і патрэб, выяўленнем новых шматлікіх відаў аматарства і сінтэтычных форм мастацкай дзейнасці, адметных рыс, характэрных для сучаснага стану сферы культуры. У іншым выпадку розныя формы арганізацыі вольнага часу застануцца без навуковага асэнсавання, што не будзе спрыяць прагрэсу грамадства ў цэлым.

Значную перспектыву мае распрацоўка дысертацыйных тэм аб заканамернасцях інтэлектуальнай арганізацыі вольнага часу. У сувязі з гэтым важныя задачы стаяць перад музеязнаўствам, краязнаўствам, мастацтвазнаўствам. Нерацыянальна і непрадбачліва аддаваць ініцыятыву ў арганізацыі вольнага часу шоу-бізнесу, асабліва ў маладзёжным асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У згаданым вышэй зборніку таксама няма матэрыялаў, прысвечаных такой галіне інфармацыйных камунікацый, як бібліятэчна-інфармацыйная справа. БДУ культуры і мастацтваў з'яўляецца адзінай навучальнай установай у краіне, дзе з 1990 г. рыхтуюцца кадры вышэйшай кваліфікацыі па навуковай спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства». Савет па абароне дысертацый па спецыяльнасцях 13.00.05 — тэорыя, методыка і арганізацыя СКД і 05.25.03 — бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства дзейнічае з 1996 г., за гэты перыяд у ім абаронена каля 30 дысертацый. Сярод іх першая і пакуль што адзіная ў рэспубліцы доктарская дысертацыя Я. Д. Грыгаровіч.

У апошні час вельмі востра паўстала пытанне аб вызначэнні месца названых спецыяльнасцей. Не ўсе даследаванні ў іх праблемным полі можна аднесці да шыфра 13.00.00 — педагагічныя навукі. Рыхтуюцца спецыялісты, абараняюцца дысертацыі, ідзе навуковы пошук, аднак складаецца ўражанне, што гэта не заўважаецца, хаця кожны навуковец, якую б галіну ведаў ні прадстаўляў, карыстаецца правіламі, распрацаванымі бібліятэчнай навукай. Многія з іх, дарэчы, прыняты ва ўсім свеце і пастаянна ўдасканальваюцца. Па не зусім абгрунтаваных фармальных прычынах не вітаюцца інавацыйныя навуковыя распрацоўкі праблем і асаблівасцей ужывання інфармацыйных сістэм у бібліятэчнай сферы. Як прыклад можна прывесці дысертацыю А. І. Шарамецьевай на тэму «Электронные информационные ресурсы библиотек: теоретико-методические вопросы библиографического описания», якая абаронена 17.10.2002 г. і не зацверджана ВАК па прычыне неадпаведнасці педагагічным навукам. У той жа час вынікі дадзенага дысертацыйнага даследавання поўнасцю і эфектыўна выкарыстоўваюцца ў дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

На сусветнай канферэнцыі па навуцы, якая адбылася ў Будапешце ў 1999 г. і на якой была прынята Дэкларацыя аб навуцы і выкарыстанні навуковых ведаў, падкрэслівалася неабходнасць рацыянальнага ўзаемадзеяння розных навук. У гэтым бачыцца будучыня навукі, у тым ліку і той яе галіны, якая даследуе працэсы ў сферы культуры. Да сінтэтычнага кірунку адносіцца такая новая галіна навукі, як культуралогія. З'яўляючыся часткай глабальнага свету, мы, па-першае, павінны вучыцца з павагай адносіцца да розных культур і традыцый, па-другое, паглыбляць веды аб адметнасці сваёй нацыянальнай культуры і яе месцы ў сусвеце, трансліраваць яе здабыткі праз сферу культуры і абагульняць у навуковых даследаваннях па культуралогіі. У 1994 г. у БДУ культуры і мастацтваў пачалася падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Навукоўцы ўніверсітэта сталі пачынальнікамі гэтай навукі ў Беларусі, імі абаронены 2 доктарскія і некалькі дзесяткаў кандыдацкіх дысертацый.

Як практыка, так і сацыялагічныя даследаванні сведчаць, што грамадства мае патрэбу ў навуцы, якая б вывучала, аналізавала і распрацоўвала методыку і прынцыпы мэтанакіраванага прагназавання і кіравання культурнымі працэсамі, уключэння асобы ў культурнае асяроддзе і далучэння яе да сацыякультурнай творчасці. Адпаведная вызначаным задачам галіна навукі можа быць названа прыкладной культуралогіяй і ўключаць такія навуковыя спецыяльнасці як 05.25.03 — бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, 13.00.05 — тэорыя, методыка і арганізацыя СКД, 24.00.03 — музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў. З увядзеннем навуковай спецыяльнасці прыкладная культуралогія можна было б зняць негатыўныя моманты падрыхтоўкі дысертацый па спецыяльнасцях 05.25.03 і 13.00.05, па якіх прысуджаюцца вучоныя ступені кандыдата педагагічных навук, што вымагае правядзення педагагічнага эксперыменту, а ў сацыякультурнай сферы яго ажыццяўленне мае свае асаблівасці і можа быць хутчэй сацыялагічным ці псіхалагічным замерам, а не паўнавартасным педагагічным эксперыментам.

У інавацыйных навуковых распрацоўках мае патрэбу такая галіна, як мастацкая культура. Асабліва перспектыўным падаецца супрацоўніцтва навукі і мастацтва ў вывучэнні і аднаўленні народных рамёстваў і музычных інструментаў. Распрацоўкі ў галіне тэхналогій новых матэрыялаў маюць самыя непасрэдныя адносіны да адраджэння некаторых духавых народных музычных інструментаў. Пра магчымасць спалучэння такіх, здавалася б, несумяшчальных з'яў сведчаць цеснае супрацоўнцтва навукоўцаў БДУ культуры і мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, а таксама падтрымка Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інавацыйных навуковых распрацовак універсітэта ў галіне беларускіх народных духавых музычных інструментаў і традыцыйных народных рамёстваў.

Накіроўваць дзейнасць асобы ў вольны час досыць складана, таму грамадства і дзяржава павінны стварыць магчымасці для рэалізацыі інтарэсаў сваіх грамадзян, а навука — даць адказы на пытанні арганізацыі вольнага часу. Каб накіраваць творчую і працоўную энергію асобы ў цывілізаванае рэчышча, неабходны цесная ўзаемасувязь як інавацыйных тэарэтычных распрацовак, так і ўменне рэалізоўваць іх на практыцы і наяўнасць адпаведных кадраў.

Галоўная роля ў гэтым працэсе належыць кадрам вышэйшай кваліфікацыі, здольным тэарэтычна абгрунтаваць магчымасць і неабходнасць ужывання інавацыйных тэхналогій у сацыякультурнай сферы і распрацаваць прынцыпы іх укаранення ў жыццё. Вырашэнне адзначаных у артыкуле асноўных праблем падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, на наш погляд, будзе спрыяць эфектыўнасці гэтага працэсу.

***Bespalaya M. A.***

*TOPICAL ISSUES OF EDUCATING HIGH-QUALIFIED SPECIALISTS IN THE SPHERE OF CULTURE*

*The article deals with organizational and methodic issues typical for the system of educating high-skilled specialists in the spheres of culture and arts.*

## ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЕ ИННОВАЦИИ В ТВОРЧЕСКИХ ВУЗАХ: ВОПРОСЫ УНИФИКАЦИИ ПРОЦЕССА

**Березкина Л. В.,**
**проректор по учебной работе Белорусской государственной академии искусств, кандидат философских наук**

Существует миф, что образование — очень консервативная сфера. На самом деле оно постоянно меняется под давлением происходящих в обществе процессов, определенных обстоятельств, родителей, самих учащихся, преподавателей.

Советская школа имела такую составляющую, как селективный механизм. Первоначально предполагалось, что в старшие классы пойдут 30% от общего числа учеников и 7% — в вузы. Считалось, что национальная элита — 3-4%, и она должна формироваться по образовательному принципу. Сейчас практически 100% выпускников идут в вузы. Наличие частных вузов и возможность учиться в государственных вузах на платной основе позволяют получить высшее образование почти всем желающим. Селективные механизмы уже не работают, что однозначно влияет на качество образования не в лучшую сторону. В то же время в существующем менталитете «отбор» (в данном случае — поступление в вуз) — это приговор успешности или неуспешности. К сожалению, эта узость понятия успеха закладывается в школе, тогда как действительная функция отбора — выявить, кто чем должен заниматься в жизни.

Разумеется, образование как сфера экономической деятельности в своем развитии подчинено законам рыночных отношений. В Республике Беларусь образование рассматривается как мощная движущая сила экономического роста, повышения эффективности и конкурентоспособности народного хозяйства и как фактор национальной безопасности и благосостояния страны, благополучия каждого гражданина. В связи с этим одним из приоритетных направлений развития белорусского образования становится обеспечение его качества. Развитие предпринимательства в сфере образовательных услуг и удовлетворение потребностей в получении высшего профессионального образования по творческим специальностям ни в коей мере не должно привести к падению качества профессиональной подготовки. И здесь существенное значение имеет роль государства в долгосрочном прогнозе структуры спроса на рынке образовательных услуг, поскольку коммерческие интересы ориентированы преимущественно на достижение краткосрочных эффектов.

В последние годы в образовании сложилась устойчивая тенденция к интернационализации и интеграции. На этом фоне углубление и диверсификация международных образовательных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ